## АД РЭДАКЦЫІ
## EDITORIAL

Шаноўнае спадарства!

Гэты год асаблівы для студэнтаў і выпускнікоў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Мы адзначаем 95-гадовы юбілей факультэта і рыхтуемся да святкавання 100-годдзя БДУ. Юрыдычны факультэт БДУ – частка нашага жыцця, душы, гэта энергія маладых сэрцаў і лепшыя сябры. Тут студэнты набываюць выдатныя прафесіі, тут адбываецца фарміраванне характару і станаўленне іх актыўнай грамадзянскай пазіцыі. Прававая навука з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці факультэта на працягу ўсяго перыяду яго існавання. Пра гэта сведчыць колькасць і якасць навуковых выданняў, цесныя шматгадовыя сувязі з навуковымі і навукова-практычнымі ўстановамі Беларусі і замежжа, фундаментальнасць даследаванняў, узнагароды нашых вучоных.

Набыццё суверэнітэту Рэспублікай Беларусь патрабавала ўдасканалення заканадаўства і стымулявала развіццё беларускай прававой навукі. Вучоныя юрыдычнага факультэта БДУ актыўна ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы нарматыўных прававых актаў, якія садзейнічаюць пабудове сацыяльнай дэмакратычнай прававой дзяржавы. Свае прапановы і меркаванні па актуальных прававых праблемах, удасканаленні заканадаўства яны адлюстроўваюць у навуковых артыкулах. «Журнал Белорусского государственного университета. Право», які з'яўляецца правапераемнікам часопіса «Веснік БДУ. Серыя 3: Гісторыя. Эканоміка. Права», лічыцца адным з вядучых навуковых выданняў Беларусі. Тут публікуюць вынікі сваіх даследаванняў вядомыя вучоныя-юрысты.

Гэты нумар не стаў выключэннем: у ім сабраны найлепшыя артыкулы сучасных навукоўцаў юрыдычнага факультэта, якія паспяхова захоўваюць і памнажаюць найлепшыя традыцыі старэйшага пакалення вучоных. Новы час уздымае новыя пытанні прававога рэгулявання, а правазнаўцы шукаюць і знаходзяць іх найбольш эфектыўныя рашэнні. Разглядаюцца такія пытанні, як канстытуцыйная мадэрнізацыя і сучасныя вектары развіцця, барацьба з арганізаванай злачыннасцю, нелегальная міграцыя, развіццё сістэмы заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб інтэлектуальнай уласнасці, прававыя праблемы забеспячэння балансу публічных і прыватных інтарэсаў у сферы прыродакарыстання, стратэгічныя аспекты процідзеяння карупцыі. Гэта толькі сціслы пералік закранутых актуальных тэм артыкулаў, прадстаўленых у юбілейным нумары.

Ад усяго сэрца віншуем выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і дактарантаў, выпускнікоў юрыдычнага факультэта БДУ. Традыцыі і высокія стандарты навукі і адукацыі на факультэце – гэта заслуга і ўклад у агульную справу кожнага члена нашай вялікай юрыдычнай сям'і. Прага да ведаў, прававыя ідэалы, патрыятызм і грамадзянская адказнасць заўсёды былі і застаюцца базай юрыдычнай адукацыі і навукі ва ўніверсітэце.

Жадаем юрыдычнаму факультэту таленавітых і працавітых студэнтаў, далейшых поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных юрыстаў-практыкаў і навукоўцаў, новых праектаў і дасягненняў!

Кандыдат юрыдычных навук, дацэнт,
дэкан юрыдычнага факультэта БДУ
***Т. М. Міхалёва***

Доктар юрыдычных навук,
прафесар, галоўны рэдактар выдання
«Журнал Белорусского государственного
университета. Право»
***С. А. Балашэнка***